# СІНТАКСІЧНЫЯ АРХАІЗМЫ Ў МОВЕ М. ГАРЭЦКАГА (НА МАТЭРЫЯЛЕ ПАДРУЧНІКА «ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЕ ЛІТАРАТУРЫ»)

**Ю. А. Гурыновіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4,*
*220050, г. Мінск, Беларусь, ule4ka2003@mail.ru*
*Навуковы кіраўнік – С. А. Важнік, кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

У артыкуле апісваецца структура простага сказа ў прозе М. Гарэцкага на матэрыяле падручніка «Гісторыя беларускае літаратуры». Найбольшую цікавасць для нас прадстаўляюць сінтаксічныя канструкцыі, якія пры супастаўленні з сучаснымі адпаведнікамі даюць падставу меркаваць пра адметнасць сінтаксічных мадэлей простага сказа, уласцівых беларускай мове пачатку ХХ стагоддзя.

***Ключавыя словы:*** сінтаксічныя архаізмы; адметныя сінтаксічныя мадэлі; спецыфіка дыяхроннага кіравання; структура простага сказа; семантычны сінтаксіс.

# СИНТАКСИЧЕСКИЕ АРХАИЗМЫ В ЯЗЫКЕ М. ГОРЕЦКОГО (НА МАТЕРИАЛЕ УЧЕБНИКА «ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЕ ЛІТАРАТУРЫ»)

**Ю. А. Гуринович**

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4,*
*220050, г. Минск, Беларусь, ule4ka2003@mail.ru*
*Научный руководитель – С. А. Важник, кандидат филологических наук, доцент*

В статье описывается структура простого предложения в прозе М. Горецкого на материале учебника «Гісторыя беларускае літаратуры». Наибольший интерес для нас представляют синтаксические конструкции, которые в сравнении с их современными аналогами дают основание предполагать о своеобразии синтаксических моделей простого предложения, характерных для белорусского языка начала ХХ века.

***Ключевые слова:*** синтаксические архаизмы; отличительные синтаксические модели; специфика диахронического управления; структура простого предложения; семантический синтаксис.

Час працы М. Гарэцкага прыпадае на 20-я гады ХХ ст., калі былі ўжо шматлікія прыклады – ўзоры напісання гісторый нацыянальных літаратур і сусветнай літаратуры, былі выпрацаваны адпаведныя канцэпцыі і падыходы.

У «Гісторыі беларускае літаратуры» Максім Гарэцкі дэманструе гнуткі даследчы розум. Ён выяўляецца ў тым, што, разглядаючы беларускую пісьменнасць да XIX ст., даследчык аперыруе фактычна гісторыка-тэарэтычным падыходам, які з XIX ст. па прычыне больш хуткага развіцця літаратуры і выхаду на літаратурную авансцэну буйных аўтараў адкрывае новыя перспектывы для стварэння канцэпцыі гісторыі літаратуры.

Звычайна звяртаюцца да тыпалогіі, апісанай ва ўніверсітэцкім курсе. Можна адзначыць наступную тыпалогію архаізмаў, прадстаўленую ў «Курсе беларускай мовы»: **семантычныя** – словы актыўна выкарыстоўваюцца ў сучаснай мове, але асобнае яго значэнне (значэнні) выходзіць з ужытку, становяцца ўстарэлым; **фанетычныя** – адрозніваюцца ад адпаведных ім сучасных слоў адным-двума гукамі; **марфалагічныя** – маюць аднолькавы корань з сучаснымі назвамі, але адрозніваюцца суфіксамі ці прыстаўкамі [4, с. 231].

У выданні В. Дз. Старычонка «Беларуская мова. Школьны слоўнік-даведнік» прадстаўлена наступная тыпалогія архаізмаў: адрозніваюць 2 тыпы архаізмаў – **лексічныя** і **семантычныя**. Сярод лексічных архаізмаў выдзяляюць: уласна лексічныя; лексіка-словаўтваральныя; лексіка-фанетычныя [4, с. 53].

Пры аналізе шэрагу навуковых крыніц мы заўважылі, што ў іх не быў адзначаны такі тып архаізмаў, як «сінтаксічныя архаізмы». Але важна падкрэсліць, што навуковыя даследаванні ў галіне мовазнаўства не стаяць на месцы.

П. П. Шуба ў межах граматычных архаізмаў асобна вылучае архаічныя словазлучэнні і канструкцыі [6, с. 297–298].

Тып «сінтаксічныя архаізмы» знайшоў адлюстраванне ў артыкулах С. А. Важніка: «Збегай, сынок, вады, або Структура простага сказа ў прозе Максіма Гарэцкага», «“Адвечны” сінтаксіс Ігната Абдзіраловіча», «Сінтаксіс “Мужыцкай праўды” і “Пісьмаў з-пад шыбеніцы” Кастуся Каліноўскага».

Найбольшую цікавасць для даследавання прадстаўляюць сінтаксічныя канструкцыі, якія пры супастаўленні з сучаснымі адпаведнікамі, даюць падставу меркаваць пра адметныя сінтаксічныя мадэлі простага сказа, уласцівыя беларускай мове пачатку XX стагоддзя.

Параўноўваючы стуктуру простага сказа на розных адрэзках часу, мы бачым, што адрозненні назіраюцца пераважна на паверхневым узроўні – «узроўні спосабаў выражэння прэдыката і таго ці іншага актанта (суб’екта, аб’екта, тэмпаратыва, каўзатыва і інш.)» [2, с. 68].

Часцей за ўсё ў сказе **прэдыкат выражаны** дзеясловам. Прааналізаваўшы падручнік Максіма Гарэцкага «Гісторыя беларускае

літаратуры», мы заўважылі наяўнасць шэрагу дзеяслоўных прэдыкатаў, якія не знайшлі сваё адлюстраванне ў сучасных слоўніках, але з дапамогай якіх у сучаснай беларускай мове маглі б утварацца пэўныя сінтаксічныя канструкцыі і рэалізоўвацца сінтаксічныя сувязі. Прывядзём некаторыя прыклады: *яе можна **ўважаць** за нашую нацыянальную мову ў пачатковым часе складаньня адзінай нацыі за прымету культурнаці можна **уважаць** тое, што ў беларускіх княздствах вельмі рана адчыніліся біскупствы...; «Слова» **ўважаюць** за памятку дружыннага эпоса, але ў ім гарманічна зліты элементы эпоса, лірыкі і навет драмы* [3, с. 4, 5, 12].

Для характарыстыкі спосабаў выражэння аб'екта была выкарыстана класіфікацыя, прапанаваная С. А. Важнікам у артыкуле «Збегай, сынок, вады, або Структура простага сказа ў прозе Максіма Гарэцкага», праз адлюстраванне спецыфічных выпадкаў архаічнага кіравання. Заўважаны наступныя канструкцыі – сінтаксічныя архаізмы [1, с. 56].

1. <u>Беспрыназоўнікавая канструкцыя > іншая беспрыназоўнікавая канструкцыя.</u>

1.1. Р. скл. > Д. скл.: ***наўчыцца*** + Р. скл.: *магчыма, што князям-літоўцам трудна было **наўчыцца** царкоўна-славянскай **мовы**...* [3, с. 15];

1.2. Р. скл. > В. скл.: ***ужыць*** + Р. скл.: *вельмі харошае «Паўчэньне ў нядзелю аб расслабленым» вызначаецца яркасьцю апавяданьня, чаго дасяг поэт, **ужыўшы драматызму*** [3, с. 11].

2. <u>Прыназоўнікавая канструкцыя > іншая беспрыназоўнікавая канструкцыя.</u>

2.1. Pr + В. скл. > Д. скл.: ***выйсці + на*** В. скл.: ***выйшла на тое**, што пачулася патрэба самастойнай творчасці* [3, с. 8].

3. <u>Прыназоўнікавая канструкцыя > іншая прыназоўнікавая канструкцыя.</u>

3.1. Pr + Р. скл. > іншы pr + Т. скл.: ***раўнаваць*** + *да* Р. скл.: *як прыгожае пісьменства, твор Данілы Паломніка стаіць нізка, прымся яго зусім ня можна **раўнаваць да твораў** Кірылы Тураўскага* [3, с. 12];

3.2. Pr + Д. скл. > іншы pr + Р. скл.: ***звяртацца*** + *к* Д. скл.: *... як яна **зварочуецца к сонцу, ветру і Няпру**, каб ратавалі князя Ігара* [3, с. 13];

3.3. Pr + М. скл. > іншы pr + М. скл.: ***пісаць*** + *у* М.скл.: *і, як кажа Кіркор, **у ёй (мове) пісаліся** ўсе акты і законапалажэньні ня толькі для беларускіх правінцый, але і для ўласнай Літвы і Жмудзі...* [3, с. 15]; ***адціснуць*** + *на* В.скл.: *...у сваёй кракаўскай друкарні, **на кошты** беларускіх вяльможаў Кішкі, Гаштольда і Скуміна-Тышкевіча, **адціснуў** пяць царкоўных кніжак у царкоўна-славянскай мове* [3, с. 22].

Тып «беспрыназоўнікавая канструкцыя > іншая прыназоўнікавая канструкцыя» не быў вызначаны ў тэксце падручніка.

У падручніку «Гісторыя беларускае літаратуры» знайшлі адлюстраванне тэмпаратывы і акузатывы.

**Выражэнне часу (тэмпаратыў)** адбываецца праз сінтаксемы: *скрозь увесь час* [3, с. 5], *ад стварэння свету* [3, с. 8], *7 $^1/_2$ вякоў* [3, с. 9], *на свой час* [3, с. 11], *у часох* [3, с. 14].

**Выражэнне прычыны** адбываецца з дапамогай наступных канструкцый-маркёраў:

**1) прыназоўнік *дзеля***: *мова беларускіх пляменьняў у тую пару свайго разьвіцьця была, пеўна, зусім яшчэ блізкая да другувіцкай мовы першых славянскіх кніжак* [3, с. 4].

**2) сінтаксемы з прычынным прыназоўнікам *з***: *складалася яна ня столькі з царкоўнымі **заданьнямі**, сколькі з чыста-творчымі, мастацкімі* [3, с. 12].

Апісаныя ў артыкуле архаічныя сінтаксічныя асаблівасці дазваляюць гаварыць пра адметныя сінтаксічныя мадэлі простага сказа таго часу, а таксама пра тое, як адбывалася станаўленне сінтаксічных норм беларускай літаратурнай мовы.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Важнік С. А.* Збегай, сынок, вады, або Структура простага сказа ў прозе Максіма Гарэцкага // Роднае слова. 2022. № 10. С. 56–59.

2. *Важнік С. А.* Сінтаксічныя інавацыі ў сучаснай беларускай літаратурнай мове: да пытання тыпалогіі // Актуальныя праблемы паланістыкі. 2007 / рэд. С. Важнік, А. Кожынава. Мінск : Права і эканоміка, 2007. С. 33–40.

3. *Гарэцкі М.* На імперыялістычнай вайне (запіскі). Менск [Мінск] : Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, 1926.

4. *Старычонак В. Дз.* Беларуская мова. Школьны слоўнік-даведнік. Мінск : Інтэрпрэссервіс. 2002.

5. *Сямешка Л. І., Шкраба І. Р., Бадзевіч З. І.* Курс беларускай мовы. Мінск : Універсітэцкае, 1996.

6. *Шуба П. П.* Современный русский язык. Ч. 1: Фонетика. Лексикология. Фразеология. Минск : Плопресс, 1998.